фективной беседы требует тщательной подготовки вопросов, достаточно трудных и одновременно доступных.

Формой диалога, используемой при проведении семинарского занятия, является "*круглый стол*". Имеет значение как рассядутся студенты (именно в виде круглого стола) и подготовка проблемных вопросов для их коллективного обсуждения. Например, по теме "Античная философия" были подготовлены такие вопросы:

1. Почему именно страны Древнего Востока и Азии стали колыбелью философии?

2. Какую современную трактовку и у какого русского мыслителя получила идея древнегреческого философа о тождестве микрокосмоса (человека) и макрокосмоса (природы)?

3. Какая идея древнегреческого философа была центральной в науке вплоть до XIX в. и о чем свидетельствует этот факт?

4. Почему настольными книгами Л.Н.Толстого были произведения Сенеки, М.Аврелия и какова судьба этих произведений в наши дни?

Возможно использование таких форм, как *интеллектуально-тренинговая игра, сюжетно-ролевые творческие задания*.

Проблема диалога как мыследеятельности становится весьма актуальной в настоящее время. Такое положение в известном смысле является следствием явного дефицита диалога в жизни общества. Диалог — это основа творческого мышления, свидетельствующая о богатстве или бедности связей человека с миром, обогащающая студентов и активизирующая их познавательную деятельность, творческое мышление, готовность к инновациям.

**П.І.Рогач**, *дацэнт*
*(Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт)*

## Прыёмы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў пры вывучэнні курса "Краіназнаўства"

Агульнавядома, што цікавасць да навучання, актыўная пазіцыя студэнта садзейнічае лепшаму засваенню ведаў. Таму выкладчык любой дысцыпліны павінен усяляк стымуляваць у іх інтарэс да працэсу пазнання.

Важным састаўным элементам працэсу асваення курса "Краіназнаўства" з'яўляюцца практычныя заняткі. На іх правядзенне адводзіцца да 50 % часу ад агульнага аб'ёму гадзін па прадмету. За гэты перыяд студэнты павінны засвоіць значную частку матэрыялу, які выносіцца на экзамен. Вопыт работы паказаў, што гэтага можна дасягнуць пры інтэнсіўнай працы студэнтаў з навуковай і перыядычнай літаратурай.

Актывізаваць працу студэнта можна рознымі прыёмамі. Адзін з іх — стварэнне і аналіз канкрэтнай сітуацыі на практычных занятках. Пры гэтым студэнт, пастаўлены ва ўмовы, калі яму неабходна грунтоўна ведаць пра тую ці іншую краіну, куды ён вязе групу

студэнтаў у якасці гіда, або стварае рэкламны праспект для турыстычнай фірмы. Для падрыхтоўкі такіх заняткаў у пачатку лекцыйнага курса студэнтам прапануецца выбраць пэўную групу краін для дэталёвага вывучэння. Звычайна для падрыхтоўкі рэфератаў па кожнай краіне прызначаюцца 4 студэнты па асноўных блоках: "Прырода і турыстычная дзейнасць", "Насельніцтва і этнаграфія", "Эканоміка і турызм", "Гістарычны агляд".

Выкладанне матэрыялу ў прысутнасці сваіх аднакурснікаў, водгукі на іх заўвагі, гатоўнасць адказаць на любое пытанне — усё гэта матывы, якія павышаюць узровень адказнасці пры падрыхтоўцы да заняткаў. Пасля выступлення, якое доўжыцца не больш як 10 хвілін, кожны студэнт можа задаць дакладчыку 1—2 пытанні. Але каб зрабіць гэта, яму таксама неабходна ведаць дадзеную краіну. Бо кожнае пытанне, якое не паўтарае змест даклада, ацэньваецца ў адзін бал, а сума набраных балаў улічваецца пры ацэнцы на экзамене. Калі ж студэнт не адказвае на пытанне, то задаўшы яго аднакурснік можа дапоўніць адказ, атрымаўшы за гэта дадатковыя балы. Зразумела, што студэнту, які не можа адказаць на шматлікія пытанні, адпаведна паніжаецца колькасць балаў.

Якая ж пры гэтым роля выкладчыка? Ён павінен быць перш за ўсе дырыжорам, сачыць за карэктнасцю пытанняў і адказаў на іх, а ў неабходным выпадку праз пытанні дакладчыку, дапаўненні, актывізаваць увагу студэнтаў на тую ці іншую інфармацыю. Гэта прымушае і выкладчыка да дэталёвай, сістэматычнай падрыхтоўкі да кожнага занятку, умения ўцягнуць у актыўную працу кожнага студэнта.

Для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці прымяняецца і такі прыём. Студэнтам на першай жа лекцыі называюцца краіны, якія будуць вывучацца далей. Па адной з іх будзе праведзена кантрольная работа. Напрыклад, два гады назад перад лекцыяй па Іспаніі студэнты ў вольнай форме выкладалі на паперы свае папярэднія веды пра гэтую краіну. Аналіз адказаў дапамог высветліць, што ўжо ведаюць большасць студэнтаў пра гэтую краіну і ў лекцыі звярнуць увагу на тыя моманты, якія ім невядомы пра Іспанію, але неабходны як будучым спецыялістам. За праведзеную кантрольную работу студэнтам таксама былі выстаўлены адпаведныя балы. Да таго ж разгляд памылак павысіў у іх цікавасць да лекцыі.

**В.И.Соусь**, *профессор*
*(Белорусский государственный экономический университет)*

## Повышение эффективности познавательной деятельности студентов при составлении бизнес-плана

Всякая деятельность включает в себя цель, средство, результат и сам процесс. Познавательная деятельность вырабатывается через систему знаний, передаваемых от одного поколения к другому.

Изменение содержания образования и обеспечение его преемст-